МАТАЙ НА ВУС

# ЗНЯВАЖАНАЯ ПАМЯЦЬ

## Два бакі адной і той жа праблемы

**Могілкі — наша агульнае месца смутку, і які там парадак, залежыць не столькі ад камунальнікаў і дэпутатаў, колькі ад нас. Дагледжанае асобна ўзятае пахаванне — прыклад для пераймання іншым. Цяпер стала модным рабіць прыгожыя афармленні, шыкоўныя помнікі, нават зоны са сталамі і лаўкамі, каб можна было пасядзець у цішыні, згадаць таго, каго ўжо няма на гэтым свеце. На памяці, як той казаў, не эканомяць. Галоўнае пры гэтым — не забыцца, што за вашай агароджай таксама чыясьці памяць. Павага да памерлых продкаў — гэта святое. Але, на жаль, чамусьці не для ўсіх.**

### Чорны бізнес

Асабіста ведаю чалавека, які, нягледзячы на вельмі паважаны ўзрост, амаль штогод прыязджае з Амерыкі ў маленькі раённы цэнтр, каб навесці на могілках сваіх бацькоў парадак. Самому яму гэта рабіць цяжка, і ён звяртаецца да тых, хто аказвае такія паслугі за грошы. Сёння іх нават у раёне, як у горадзе N з рамана Ільфа і Пятрова, колькі заўгодна. Вось амерыканец і звярнуўся ў адно такое бюро, аддаў грошы і спакойна паехаў у свае Штаты. Рытуальшчык спачатку абяцаў добраўпарадкаваць пахаванне восенню, цяпер адкладвае да вясны. Стары чалавек на тым канцы зямлі сабе месца не знаходзіць, шукае, як паўплываць на гэтага махляра. Пакуль, на жаль, безвынікова.

Такіх выпадкаў, як высветлілася, дастаткова. Апошнім часам стала больш нядбайных прадпрымальнікаў, якія бяруць грошы за добраўпарадкаванне месцаў пахаванняў, а потым знікаюць. Ці нешта робяць, але так, што ні сабе ні людзям. Дабіцца праўды бывае вельмі цяжка. Даводзіцца абіваць парогі юрыстаў, звяртацца ў суд, укладваць дадатковыя грошы.

У Магілёўскім гарадскім таварыстве па абароне спажыўцоў могуць расказаць шмат такіх гісторый. Прычым серыйных, накшталт вось гэтай. Адна магіляўчанка заказала афармленне пахавання ў прадпрымальніка-рытуальшчыка. Ён нешта рабіў, але пасля яго ўмяшання пахаванне стала выглядаць яшчэ горш, чым было да гэтага: аднекуль замест яшчэ нармальнага століка з'явіўся стары і ржавы, а лаўка наогул знікла. У судзе высветлілася, што прадпрымальнік добраўпарадкаваў могілкі сваіх кліентаў за конт іншых пахаванняў. Напрыклад, дзесьці знімаў агароджу і прывозіў на новы «аб'ект» — адным словам, перастаўляў могільнікавую маёмасць з аднаго месца на другое. Калі незадаволеных паслугамі рытуальшчыка стала шмат, ён закрыў свой гандлёвы пункт і перастаў адказваць на тэлефонныя званкі.

— Прэтэнзій да якасці работы прадпрымальнікаў, занятых у рытуальным сэрвісе, нямала, — адзначыла **старшыня Магілёўскай гарадской арганізацыі абароны спажыўцоў Вольга БАРАНАВА.** — Бывала, што фота чалавека на помніку атрымлівалася перавернутае або імя нябожчыка блыталі з імем заказчыка. Нерэдкасць, калі зацягваюць тэрміны выканання дагавора, мяняюць дызайн надмагілля, ненадзейна замацоўваюць элементы кампазіцыі. Здаралася, што чалавек заказваў помнік з мармуру, а яго выраблялі з больш таннага матэрыялу. Усіх выпадкаў нават адразу і не ўспомніш. Бывае, што за месяц звяртаецца болей за дзесяць чалавек. Прычым гісторыі такія, што становіцца страшна за людзей, якія так абыходзяцца з чужой памяццю. Мы ж таксама не вечныя.

### А прыбраць за сабой?

А цяпер замалёўка з Глушанскага сельсавета Бабруйскага раёна. Не памылюся, калі скажу, што яна тыповая. У якасці пацярпелых выступаюць ужо не фізічныя асобы, а тыя, хто сочыць за парадкам на могілках.

— На нашай тэрыторыі восем грамадзянскіх могілак, — кажа **старшыня Глушанскага сельсавета Марыя СУШЧАНКА.** — Усе магілы на ўліку, у кожнага пахавання свой парадкавы нумар, зафіксаваны ў спецыяльнай праграме — лакальнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэме органаў мясцовага кіравання і самакіравання пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню. Самая вялікая праблема, адпаведна, самая дарагая — знос аварыйных дрэў. Улічваючы, як хутка сохнуць могілкавыя бярозы і сосны, даводзіцца часта наймаць альпіністаў, каб іх выдаляць. Дзесьці атрымліваецца прыцягнуць да фінансавання мясцовых жыхароў, але часцей за ўсё цяжар цалкам кладзецца на сельсавет. Пасля таго як папрацуюць альпіністы, запрашаем людзей на суботнік. Больш сумленныя прыходзяць, а некаторыя толькі тэлефануюць і скардзяцца, што мы насмецілі. Даводзіцца нагадваць, што клопат пра могілкі — гэта агульная справа. Мы ліквідавалі аварыйную сітуацыю, а вы чым дапамаглі?

> «Клопат пра могілкі — гэта агульная справа. Мы ліквідавалі аварыйную сітуацыю, а вы чым дапамаглі?

Апошнім часам з'явілася новая тэндэнцыя. Калі раней людзі прыходзілі прыбрацца на могілкі раз у год — перад Радаўніцай, — то цяпер ідуць круглы год. І нясуць на сметнік і траву, і пясок, і цэглу. Даводзіцца рэгулярна вывозіць горы смецця, а гэта таксама вялікія фінансавыя затраты. Але ёсць і такія, хто сваё смецце зусім не выносіць, а проста адгортвае ўбок. На могілках, вядома, не павесіш фотафіксатары, а значыць, за руку нікога не схопіш. Некаторыя кідаюць на тэрыторыі нават старыя дэмантаваныя помнікі. Такое ўражанне, што чалавек, які заказаў добраўпарадкаванне пахавання сваіх продкаў, не стаў абцяжарвацца тым, каб прыняць работу, якую для яго зрабілі. Добра, калі атрымліваецца знайсці гаспадара, але часта помнік абязлічваецца — адбіваюцца таблічкі, каму ён належаў. І тады вынас аб'ёмістага прадмета робіцца ўжо праблемай сельсавета.

Хацелася б, каб грамадзянская пазіцыя людзей была не спажывецкая, а больш свядомая. Чыста там, дзе людзі наводзяць парадак, не абражаючы памяць тых, чые пахаванні знаходзяцца побач.

### Павага перш за ўсё

**Старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях Алена ШУМЕЙКА** прыгадала, як адзін з магілёўскіх рытуальшчыкаў за махінацыі на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай абласцей атрымаў чатыры гады калоніі строгага рэжыму. Чалавек панёс пакаранне, але ж гэта асобна ўзяты выпадак. Праблема, на жаль, засталася.

— Каб не стаць заложнікам махляроў, трэба перад тым, як звярнуцца ў нейкую рытуальную фірму, праманіторыць яе статус і паглядзець водгукі на якасць паслуг, — раіць Алена Шумейка. — Калі шмат негатыву, лепш устрымацца і даверыць свае грошы іншым. Нават калі вы ўпэўнены, што вас не абдураць, не варта ўносіць адразу ўсе грошы за паслугі. Дастаткова перадаплаты, прыняцце якой трэба абавязкова пацвердзіць адпаведным дакументам. Калі якасць работ нізкая або тэрмін выканання заказу зацягваецца, смела шліце выканаўцу пісьмовую прэтэнзію. У крайнім выпадку звяртайцеся ў міліцыю або суд.

А як быць у цэлым з могілкамі? Як растлумачыць чалавеку, што парадак на іх залежыць не толькі ад суседа і так званага балансатрымальніка, а і ад яго таксама? Тут, на жаль, з парадамі цяжэй, бо сумленне — яно або ёсць, або яго няма. Гэта як у вялікім шматпавярховіку, дзе жыве адразу вялікая колькасць народу. Калі ёсць узаемаразуменне і павага да іншых, то і ў пад'ездзе чыста, і ў двары кветкі буяюць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Фота носіць ілюстрацыйны характар.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот, №** | **Наименование** |
| 1 | **Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-100264) общей площадью 106,8 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Первомайский с/с, д. Кальчицы, ул. Новины, 5А. Земельный участок общей площадью 0,1048 га предоставлен на праве аренды по 27.02.2039 г. для обслуживания здания магазина |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 10 600,00 бел. руб.** | |
| 2 | **Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-74836) общей площадью 98,04 кв. м по адресу: Минская область, Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Хорошево, 3. Составные части и принадлежности: сарая (2 шт.), уборная. Земельный участок общей площадью 0,0668 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации магазина |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 9 700,00 бел. руб.** | |
| 3 | **Здание магазина № 26 (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-26618) общей площадью 55,0 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Волошево, магазин № 126. Составные части и принадлежности: склад, сарай (2 шт.). Земельный участок общей площадью 0,0422 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживание и эксплуатация строений и сооружений |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 5 100,00 бел. руб.** | |
| 4 | **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) (инв. номер 640/С-84559) общей площадью 286 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 136А/2. **Здание кирпичное (здание неустановленного назначения)** (инв. номер 640/С-84557) общей площадью 40,4 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 136А/1. Земельный участок общей площадью 0,1009 га предоставлен на праве аренды по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 36 416,00 бел. руб.** | |

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 03.12.2019 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Срок подачи документов: 29.11.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-33527 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – кафе «Визит»), общей площадью 1410,10 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422050400002002738, площадью 0,2690 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадь – 0,2690 га

**Начальная цена продажи – 192 000 руб. (сто девяносто две тысячи рублей) с учетом НДС**

Сумма задатка – 19 200 руб. (девятнадцать тысяч двести рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 18 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.01.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 14 ноября 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*


**9 лістапада а 14-й гадзіне** ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна адбудзецца адкрыццё першага ў Беларусі бюста беларускаму пісьменніку

**Алесю Адамовічу.**

Даведкі па тэлефонах арганізатараў: Андрэй 8-029-1238873, Ванда – 8-044-5326482

